УДК [811.161.2+811.161.3]'04'255

*І. П. КЛІМАЎ*

# ПЕРАКЛАД І ПЕРАКЛАДНАЯ МОВА Ў ДАЎНІМ ПІСЬМЕНСТВЕ БЕЛАРУСАЎ І ЎКРАІНЦАЎ

**Резюме.** Обсуждаются основные теоретические проблемы в понимании сущности и специфики переводческой деятельности белорусов и украинцев XIV–XVIII вв., которая была представлена в основном переводом с близкородственных и близкоструктурных языков (польского, чешского, церковнославянского). В такой ситуации перевод, собственно, заключался в сохранении многих элементов оригинала в неизменном виде либо с помощью незначительных изменений (адаптаций), а также путем их замены этимологически тождественными эквивалентами. Перевод в подобной ситуации охватывал незначительную часть элементов оригинала, могли также осуществляться заимствования. В переводе практически всегда главенствовал пословный принцип. Подобная практика предопределяла появление в древнем письменном языке белорусов и украинцев своеобразных типов, или вариантов, переводного языка, близких по своим особенностям к другим славянским языкам. Анализ таких переводов предпринимается в научной литературе фактически впервые, поскольку специалисты обычно игнорируют эти переводы как слишком примитивные.

***Ключевые слова:*** перевод; техника перевода; оригинал; субституции; транслитерация; старобелорусский/староукраинский язык; церковнославянский язык; польский язык; чешский язык.

**Abstract.** Basic theoretical problems related to understanding of the nature and specificity of translating activity of Belarusians and Ukrainians of the XIV–XVIII centuries are discussed. That activity was mainly presented by translation from closely-related and closely-structural languages (Polish, Czech, Old Church Slavic). In such situation, a translation, actually, consisted of maintenance of many elements of an original in an unchanging state or in a state with insignificant changes (such as adaptations); some other elements replaced by etymologically identical equivalents, too. In such a situation, a translation proper embraced an insignificant part of elements of an original; there can be proceeded borrowings. The word-by-word principle predominated practically constant in such translations. That practice predetermined appearance of some unique types (or variants) of the translating language in the ancient written language of the Belarusians and Ukrainians; the translating language was near by its features to other Slavic languages. Such analysis of the translations are undertaken in scientific literature first, because specialists usually ignore such translations as very primitive ones.

***Key words:*** translation; translation technique; original; substitutions; transliteration; Old Belarusian/Old Ukrainian; Old Church Slavic; Polish, Czech.

Даследаванне прыёмаў і тэхнікі перакладу ў старабеларускай/стараўкраінскай кніжна-пісьмовай мове (далей яна называецца «руськай» як мова русінаў – усходнеславянскага насельніцтва ў складзе ВКЛ і/ці Рэчы Паспалітай)[1] пакуль не атрымала належнай распрацоўкі ў навуцы. Хаця многія даследчыкі аналізавалі як перакладныя творы і іх мову, так і асаблівасці перакладной мовы ўсходніх славян наогул, усё ж вывучэнню прынцыпаў і працэдур перакладу ў «руськай» мове надавалася непараўнальна менш увагі. У славістычных публікацыях XIX–XX стст. у лепшым выпадку можна сустрэцца з фрагментарнымі абагульненнямі ці (часцей) асобнымі заўвагамі пры аналізе канкрэтных перакладных помнікаў. З ліку неславістычных даследаванняў варта згадаць працы заходніх біблеістаў, дзе пералічаны прынцыпы і працэдуры, што звычайна выкарыстоўваюцца пры біблейных перакладах (гл. Nida 1964, 193–239). Аднак такія пералікі заснаваны амаль выключна на матэрыяле сучасных перакладаў і экзатычных моў і мала падыходзяць для аналізу «руськіх» помнікаў. Гістарычныя даследаванні перакладчыцкай традыцыі, што развівалася ў міжземнаморскім і заходнееўрапейскім арэалах, занадта агульныя ў апісанні прыёмаў і метадаў старажытных перакладчыкаў (гл. Nida 1964, 11–18, 22–24, 26–29; Kelly 1979, 109–113, 134–143, 215–221) і не заўжды стасуюцца з усходнеславянскім арэалам. У выніку трэба канстатаваць, што вывучэнне даўняга «руськага» перакладу знаходзіцца пакуль на перыферыі навуковага пошуку.

Між тым аналіз прыёмаў і тэхнікі «руськіх» перакладчыкаў мае далёка не акадэмічны характар. На думку асобных навукоўцаў, характар перакладу ў «руськай» мове непасрэдна звязаны з прыродай гэтай мовы, прадстаўленай у такіх перакладах. Так, некаторыя вучоныя лічаць, што сэнсам перакладу ў русінаў было толькі пісьмо (замена графікі), а пераклад меў больш рытуальны і сімвалічны характар, чым служыў мэтам камунікацыі (гл. Strumińskyj 1984, 21–22; Frick 1994, 221). У такіх перакладах «руская» мова выглядае як польская, толькі запісаная кірылічнымі літарамі (гл. Толстой 1988, 63, 67; Успенский 2002, 394). У прыватнасці, на думку М. Талстога, такая «руськая» мова ўяўляе сабой «своеобразную транслитерацию с латиницы в кириллицу, с изменением только некоторых фонетических соответствий и сохранением устойчивых морфологических восточнославянских черт» (Там жа 1988, 63). На гэтай падставе былі зроблены крайнія высновы пра паліятыўны характар «руськай» мовы, яе несамастойнасць ды штучнасць (гл. Толстой 1988, 61–62, 67, 68, 71; Verkholantsev 2008, 15). На думку некаторых даследчыкаў, «руськія» інтэлектуалы наогул гутарылі выключна па-польску і толькі запісвалі кірылічнымі літарамі свае тэксты, паколькі адрасавалі іх аўдыторыі, што не ведала польскага пісьма (Там жа 2008, 14–16, 135–140). Ва ўсялякім выпадку адукаваныя асобы чыталі польскія творы ў арыгінале, не патрабуючы перакладу, тады як на «руськую» мову перакладаліся ў асноўным перыферыйныя і

[1] Выбар такога тэрміна «руськая» (мова) зроблены, каб пазбегнуць дыскусій наконт характару мовы («простая» – «руськая», актавая – літаратурная) і яе дыялектнай асновы (беларуская або ўкраінская), што патрабуе адмысловай тэорыі і складанага аналізу. Напрыклад, некаторыя айчынныя даследчыкі лічаць старабеларускімі нават царкоўнаславянскія пераклады (гл. Будзько 2008, 26–30). Такая дыскусійнасць прыроды і межаў мовы старажытнага перакладу ўласціва наогул усходне- і паўднёваславянскаму пісьменству (гл. Лихачев 1983, 415–423) і выклікае справядлівую крытыку (гл. Семенец, Панасюк 1991, 318–319, 328, 329). Таму выбар у дадзенай працы зроблены на карысць аднаго і нейтральнага тэрміна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выпадковыя тэксты, разлічаныя на непатрабавальнага і сацыяльна невысокага чытача (гл. Семенец, Панасюк 1991, 323–324, 326, 330, 336).

Гэта патрабуе звярнуць асаблівую ўвагу на характар і ролю перакладу ў «рускай» мове і (хаця б схематычна) вызначыць існаваўшыя ў ім асноўныя падыходы (практыкі). У іх межах неабходна акрэсліць найважнейшыя перакладчыцкія сродкі (прыёмы ці мадэлі) і, па магчымасці, ахарактарызаваць іх галоўныя асаблівасці або праявы. Асноўная ўвага ў дадзенай працы скіравана на найбольш пашыраныя і тыповыя, нават рутынныя з'явы ў галіне перакладу – тое, што звычайна і лічыцца тэхнікай перакладу (гл. Верещагин 1972, 113). Любы канкрэтны матэрыял далей мае толькі ілюстрацыйнае, чыста дапаможнае значэнне (таму цытаты з крыніц падаюцца ў спрошчаным, нармалізаваным запісе). Сэнс дадзенай працы – хутчэй у тэарэтычным асэнсаванні з'яў, уласцівых перакладу даўніх русінаў (беларусаў і ўкраінцаў).

Дзеля пэўнага спрашчэння далей прымаецца, што пераклад захоўвае семантычную тоеснасць з арыгіналам, выпадкі семантычнай мадуляцыі (семантычнага зруху: звужэння, пашырэння, кампенсацыі і г. д.) і памылкі, непазбежныя ў любым перакладзе (гл. Марчук 1985, 66–67), не ўлічваюцца. Таксама не абмяркоўваюцца пазнейшыя выпраўленні (рэдагаванні) перакладу паводле арыгінала(ў), удзел у працы над перакладам некалькіх асоб і да таго падобныя выпадкі. У разлік не бяруцца розныя літаратурныя тэхнікі (пераказ, узнаўленне, выклад, перайманне, стылізацыя, імітацыя), заснаваныя на зберажэнні сюжэта пры адмове ад захавання так званых паверхневых моўных узроўняў (Там жа, 76) – базавых сінтаксічных і семантычных структур арыгінала, а таксама ад яго кампазіцыйных і нават жанравых структур. Адрозненне паміж адаптацыйным і інтэрпрэтацыйным перакладамі ў дадзенай працы ігнаруецца і не разглядаецца на ўзроўні дэфініцый.

Даўні пераклад і паводле сваёй тэхнікі, і паводле сваіх мэт адрозніваўся ад сучасных уяўленняў пра дынамічны (сэнсавы, эквівалентны, функцыянальны, адэкватны і да т. п.) пераклад. Аснову яго складаў паслоўны прынцып, пры якім значнае месца займалі запазычанне і пумарфемны пераклад; толькі ў некаторых выпадках перакладчыкі звярталіся да парафраза. З заходняй навуковай літаратуры вядома, што паслоўны прынцып дамінаваў у еўрапейскіх перакладчыкаў (асабліва біблейных) – ад эпохі позняй Антычнасці аж да класіцызму (гл. Nida 1964, 12–24; Kelly 1979, 34–45, 109–113, 121–138, 181). Паслоўны прынцып быў уласцівы і царкоўнаславянскім перакладам (гл. Верещагин 1971, 27–44, 64–69, 140; Верещагин 1972, 112; Успенский 1983, 20–23; Успенский 2002, 56–58), хаця нярэдка там сустракаецца і калькаванне грэчаскіх слоў, асабліва кніжных (гл. Верещагин 1971, 45–47, 169; Успенский 2002, 58–62). На думку некаторых вучоных, паслоўны пераклад – ідэальны (гл. Марчук 1985, 76), а само слова – ідэальная адзінка перакладу (гл. Марчук 1985, 68–69).

Уважлівы аналіз разнастайных пісьмовых помнікаў «рускай» мовы, перш за ўсё перакладных, прыводзіць да высновы пра панаванне ў «рускіх» перакладчыкаў паслоўнага прынцыпу (нават адхіленне ад яго ў бок парафраза было выключна рэдкім)[2]. Тым не менш гэты прынцып даваў розны вынік у самім характары перакладу, што залежала ад яго структурна-генетычнай блізкасці да мовы арыгінала, а таксама ад тагачасных уяўленняў наконт прыроды ўсёй кніжна-пісьмовай мовы. Практычна пад блізкасцю ў дадзенай працы маецца на ўвазе зразумеласць (хаця б частковая, адносная) ці незразумеласць (абсалютная) адной мовы для носьбітаў іншай мовы (гл. Верещагин 1972, 128, сн. 1).

Першы вынік можна назіраць пры перакладзе са структурна і генетычна аддаленых (ці зусім ням роднасных) моў: лацінскай, грэчаскай, яўрэйскай, арабскай, кыпчакскай і да т. п. Сутнасцю і мэтай перакладу ў гэтым выпадку была перадача семантыкі арыгінала, паколькі перанос яго структурных рыс быў зусім ці амаль немагчымы. Такі пераклад быў максімальна непадобны да свайго арыгінала паводле марфемікі, лексікі, сінтаксісу. Аднак гэта непадабенства абумоўлена не прынцыпам перакладу (ён заставаўся адзіным для эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу – паслоўным), а значнай структурнай дыстанцыяй паміж мовамі арыгінала і перакладу[3]. Варта адзначыць, што да гэтай моўнай дыстанцыі амаль заўжды дадавалася яшчэ і адрозненне паводле графікі. Такі пераклад ледзь не аўтаматычна выглядае для сучасных даследчыкаў як больш с к л а д а н а  а п р а ц а в а н ы. Але ці сапраўды ён такім з'яўляецца? Не выключана, што ў сучасных даследчыкаў (якім самім у гэтым выпадку ўжо менш зразумелыя мова арыгінала ці мова перакладу) пры ацэнцы такіх перакладаў узнікае ілюзія іх большай самастойнасці і літаратурнасці. Найбольш паказальным прыкладам могуць служыць

---

[2] Адзінкай такога перакладу служыла звычайна марфалагічнае слова (гэта значыць у складзе яго формаў, напр.: пол. *wybawiłeś – выбавилъ еси*, пол. *się ukazały – указалися*), аднак межы гэтай адзінкі (нават у аднаго і таго ж перакладчыка) маглі быць рухомымі, залучаючы і іншыя кампаненты, што суадносіліся са словам: чэш. *dal požehnanije – благословилъ*. Пры жаданні гэтая адзінка разумелася перакладчыкам то максімальна падзельна (перакладаліся ўсе кампаненты формы): пол. *jesmy – есмы*, пол. *powstaliśmy – повсталисмы*, пол. *będzie przyszed – будеть пришолъ*, то максімальна агульна: пол. *jesmy – есмъ*, *powstałem – есми повсталъ/всталъ*, пол. *będzie przyszedł – приду*. Больш дэталёва дэфініцыя і межы адзінкі «рускага» перакладу ў дадзенай працы не разглядаюцца.

[3] Параўн., напрыклад, дэфініцыю адзінкі такога перакладу, якой вымушаны апераваць даследчык пры аналізе ранніх царкоўнаславянскіх перакладаў з грэчаскай мовы: гэта марфалагічнае слова, узятае ў сукупнасці сваіх формаў разам з артыклем і прыназоўнікам, дапаможным дзеясловам і прыдзеяслоўнымі зваротнымі часціцамі (гл. Верещагин 1971, 35–39, 128, 208, 210). Натуральна, такой адзінкай (у такіх межах) немагчыма карыстацца пры аналізе, напрыклад, «рускіх» перакладаў з польскай або царкоўнаславянскай мовы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раннія царкоўнаславянскія пераклады грэчаскіх тэкстаў (у асноўным рэлігійных). У славістыцы існуе нямала прац, прысвечаных гларыфікацыі падобных перакладаў, падкрэсленню майстэрства і чуласці іх перакладчыкаў. Аднак здаецца, што выключнасць падобных перакладаў абумоўлена не ў апошнюю чаргу якраз іх структурнай дыстанцыяй з мовай арыгінала.

Зусім іншы вынік у «руськай» мове можна назіраць пры перакладзе са структурна блізкіх ды блізкароднасных моў: польскай і чэшскай, царкоўнаславянскай – у гэтым выпадку арыгінал быў (або здаваўся) дастаткова ці хаця б часткова зразумелым нават маналінгвам. Тады сутнасць і мэта перакладу заключалася ўжо фактычна ў пераносе (захаванні) зразумелых, ясных (у тым ліку і меркавана) кампанентаў (як правіла, агульнаславянскіх) арыгінала і замене (мадыфікацыі, сінанімізацыі, уласна перакладзе і г. д.) кампанентаў незразумелых, няясных (іх звычайна было менш). У выніку такі пераклад атрымліваўся максімальна блізкім да арыгінала ў марфеміцы, лексіцы, сінтаксісе, а нярэдка – нават у арфаграфіі. Такі пераклад можна акрэсліць як максімальна літаральны (ён таксама быў заснаваны на паслоўным прынцыпе). Вядома, што чым менш адрозныя паміж сабой кантактуючыя культуры, тым больш літаральным з'яўляецца паміж імі пераклад, і наадварот (гл. Марчук 1985, 40, 56, 58).

У сучасных даследчыкаў, выхаваных на практыцы дынамічных, функцыянальных перакладаў, гэта нараджае адмоўную ацэнку падобных звышлітаральных перакладаў як прымітыўных і недасканалых, што вядзе да неадэкватнай і часта негатыўнай ацэнкі ўсёй «руськай» мовы. Між тым літаральны пераклад разглядаецца некаторымі вучонымі як найбольш дасканалы, нават ідэальны, паколькі ў ім адсутнічае або мінімізаваны суб'ектыўны погляд, тлумачэнне, інтэрпрэтацыя перакладчыка, увядзенне дадатковых сродкаў, не абумоўленых арыгіналам (гл. Марчук 1985, 39, 40, 56).

Максімальны літаралізм у русінаў меў намнога большую сацыяльную перавагу перад тым перакладам, які патрабаваў складанай апрацоўкі. Апошні пераклад быў немагчымы без добрага ведання зыходнай мовы – лацінскай, грэчаскай, яўрэйскай, што сустракалася толькі ў нямногіх беларусаў і украінцаў таго часу. Наадварот, польская і (з пэўнымі абмежаваннямі) царкоўнаславянская мовы былі шырока распаўсюджаны ў пісьмовай (і часткова вуснай) камунікацыі ВКЛ і ўсходнеславянскіх земляў Рэчы Паспалітай. Максімальны літаралізм не патрабаваў адукацыі ці нейкай папярэдняй падрыхтоўкі для перакладу і добра падыходзіў да ўмоў функцыянавання рукапіснай кнігі, якая панавала ва ўжытку ўсходніх славян да XVIII ст. Таму максімальны літаралізм лёгка было рэалізоўваць на практыцы, і заснаваны на ім пераклад шырока выкарыстоўваўся, напэўна, ці не ўсімі пісьменнымі людзьмі Беларусі і Украіны. Ён фактычна дазваляў кожнаму пісьменнаму чалавеку зрабіцца яшчэ і перакладчыкам.

Няясна, ці быў вядомы гэты падыход яшчэ з часоў Старажытнай Русі, ці ён нарадзіўся толькі ў XV ст. Больш верагодным здаецца апошняе: і пісьмовая камунікацыя, і насельніцтва Старажытнай Русі былі адносна гамагенныя, і патрэбы ў нейкім частым, рэгулярным перакладзе з розных моў у яе пісьменстве не ўзнікала. Аднак вядома, што з XIV ст. царкоўнаславянскія пераклады з грэчаскай мовы становяцца да няўцямнасці літаральнымі (гл. Besters-Dilger 1992, 29–32), што трэба звязваць з уплывам ідэй ісіхазму. Заняпад максімальнага літаралізму звязаны з надыходам рамантызму, які прынёс інакшае разуменне мэты і тэхнікі перакладу: тэхніка замяняецца мастацтвам (гл. Верещагин 1972, 113–114, 173–174).

Пры максімальна літаральным перакладзе ў русінаў ужываліся два асноўныя падыходы, ці практыкі (для іх наймення выкарыстаны ўмоўныя, рабочыя тэрміны), у залежнасці ад мовы арыгінала. Такія падыходы (практыкі) былі звязаны пераважна з перадачай лексікі і часткова марфемікі:

1) транслацыя – захаванне слоў і формаў арыгінала пры замене яго графікі (практычна гэта транслітарацыя, якая, аднак, абавязкова суправаджаецца рознымі працэсамі адаптацыі, а таксама памарфемным перакладам, словаўтваральнай і лексічнай, часам граматычнай варыяцыяй)[4]; гэта практыка выкарыстоўвалася пры перадачы тэкстаў на заходнеславянскіх мовах (польскай і чэшскай) з лацінкавай графікай. У дачыненні да арыгінала такі пераклад характарызуецца:

● блізкай лексікай і граматыкай (параўнальна з царкоўнаславянскай сістэмай);

● рознай графікай і арфаграфіяй;

2) інфільтрацыя – перанос «руськіх» слоў і формаў (у тым ліку разам з засвоенымі мовай паланізмамі і іншымі запазычаннямі) ва ўжо існуючы тэкст-арыгінал – царкоўнаславянскі (які таксама зазнаваў пэўную адаптацыю) – пры элімінацыі яго менш зразумелых, архаічных элементаў. Гэта практыка выкарыстоўвалася для царкоўнаславянскіх тэкстаў, і пераклад, што атрымліваўся ў такім выніку, характарызаваўся:

● ідэнтычнай графікай і блізкай арфаграфіяй;

● рознай лексікай і граматыкай (асабліва ў дзеяслоўных і займенных формах), у такіх перакладах (ці ўсё ж «перакладах» – імітацыях перакладу?) нярэдка назіраецца выразнае змяшэнне ўсходне-, заходне- і паўднёваславянскіх элементаў.

---

[4] Нават у паралельных публікацыях «руськіх» аўтараў канца XVI – пачатку XVII ст. (гл. Толстой 1983, 63–67) за межамі графікі не назіраецца дакладнай адпаведнасці паміж «руськім» і іншаславянскім тэкстамі, заўжды трапляюцца адрозненні не толькі ў граматычных і марфалагічных формах, але і ў сінтаксісе і нават лексемах. Гэта дае падставу бачыць у такіх тэкстах не проста факт транслітарацыі, а казаць менавіта пра пэўную перакладчыцкую практыку (падыход) – транслацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне адразу дзвюх практык (падыходаў) – і трансляцыі, і інфільтрацыі – асабліва добра бачна на прыкладзе біблейных перакладаў (і перакладаў некаторых іншых рэлігійных твораў), дзе амаль заўжды выкарыстоўваліся і заходне- і царкоўнаславянскія крыніцы разам. З іх найбольш паказальнымі (у плане і сваёй тэхнікі, і сваёй друкаванай формы) з'яўляюцца біблейныя пераклады Францішка Скарыны і Васіля Цяпінскага (па меншай меры для XVI ст.). Гэтыя практыкі таксама можна сустрэць у іншых перакладах (літаратурна-займальных, гістарычных, навукова-вучэбных твораў), але звычайна толькі паасобку, паколькі, як правіла, арыгіналам для іх служыў(лі) тэкст(ы) на адной мове (заходне- ці царкоўнаславянскай). Апрача таго, біблейным перакладам уласціва тэкстуальная дакладнасць (сінтаксічная і семантычная), тады як у перакладах іншых твораў, асабліва нерэлігійных, трапляецца шмат адхіленняў ад арыгінала (скарачэнні/пашырэнні, пераасэнсаванні, памылкі і г. д.), выпадкі літаратурнай перапрацоўкі (гл. Лихачев 1983, 404–406; Семенец, Панасюк 1991, 324–325, 327, 330) і намнога большы дыяпазон недакладнасцей у перадачы семантыкі (прыблізнасць, адвольная сінанімізацыя і інш.). Гэтыя змены збольшага залежаць ад прыхамаці перакладчыка (хаця часта абумоўлены той ці іншай ідэалогіяй або кампетэнцыяй) і маюць то стылістычны, то літаратурны характар. Яны вельмі блізкія да кампіляцыйнай або рэдактарскай працы сярэднявечных перапісчыкаў, якая неаднаразова апісвалася ў навуковай літаратуры (гл. Лихачев 1983, 85–87, 92–95, 355–441).

Апрача падобных сэнсавых, зместавых адхіленняў пры перакладзе (таксама «руськім») можа ўзнікаць разнастайная моўна-перакладчыцкая в а р ы я т ы ў н а с ц ь, не звязаная са зменай сэнсу і кампазіцыі арыгінала. Такую варыятыўнасць некаторыя даследчыкі называюць трансфармацыямі (гл. Gardiner 1963, 118–129) ці транспазіцыямі (гл. Kelly 1979, 157–158); яна больш аднатыпная, таму яе лягчэй аб'яднаць у пэўныя класы, напрыклад:

• славаўтваральная: царк.-слав. *мытарь – мытникъ*, *вдовица – вдова*, *веровати – уверити*; чэш. *hledala – глядела*; пол. *miarka – мера*, *łodź – лодья*, *pokarm – кормъ*;

• марфалагічная (часцінамоўная) – замена адной часціны мовы іншай: царк.-слав. *книжникъ – учоный*, *праведникъ – справедливый*, *исусъ назоренинъ – исусъ назорейский*, *вертепъ разбойникомъ – печора розбойничая*; сюды можна аднесці і мены генетыўнай і атрыбутыўнай канструкцый: царк.-слав. *стража нощи – сторожа ночная*, *храм(ина) царя – полаты царевы/палацъ царский* (< пол. *sala królewska*; чэш. *sienie královské*, генетыўнай і дэліберацыбутыўнай канструкцый: царк.-слав. *слухъ исусовъ – слухъ о исусе*, *помилуй ны/мя – змилуйсе над нами/надо мною* (< пол. *zmiłuj się nad nami/nade mną*) і г. д.;

• граматычная (катэгарыяльная) – змена асобнага граматычнага значэння, напрыклад замена мн. л. на адз. л.: царк.-слав. *приидуть вся сия – приидеть все тое*, *на небесехъ – на небе*, замена аднаго трывання на другое: царк.-слав. *падаеть – упадеть*, аднаго часу дзеяслова на іншы: пол. *posyłam – пошлю*, *nacągnął – вытягну*, у тым ліку розныя змены і па сістэмных падставах, напрыклад замена парнага ліку на мн. л.: царк.-слав. *приведета – приведите*; пол. *dwie nodze – две ноги*;

• сінтаксічная, напрыклад перастаноўка слоў месцамі: чэш. *milost byla – была милость*; царк.-слав. *по немъ ити – ити за нимъ*, *от часа того – от тое годины* (< пол. *od onej godziny*), мена склонаў: царк.-слав. *скрежетъ зубомъ – скригитанье зубовъ*, *до конца небу – до конца неба*, мена прыназоўнікавых і беспрыназоўнікавых канструкцый: царк.-слав. *единому ихъ – одному с нихъ*, *тобою – отъ тебе*, *пророкомъ – черезъ/отъ пророка* (< пол. *przez/od proroka*) і г. д.;

• лексічная, якая звычайна прадстаўлена недадыферэнцыяцыяй (перакладам некалькіх слоў адным): царк.-слав. *молитву деяше – молитисе* ці звышдыферэнцыяцыяй (перакладам аднаго слова некалькімі): царк.-слав. *вся дни – по все дни* (< чэш. *po wšečki dni*), *благовѣствують – евангелии учаться* ці *евангелию приимують*, *тьма – десеть тисячъ*, *миротворцы – покой чинячие*, *елико – што колвекъ* ці *которий кольвекъ*.

Такая варыятыўнасць (трансфармацыі, транспазіцыі) уласціва любым перакладам (хаця, натуральна, неабавязковая) і ўзнікае па самых розных прычынах. Часам яна абумоўлена несупадзеннем моўных сістэм арыгінала і перакладу, часам – гэта «выпраўленні» ці «ўдакладненні» арыгінала, прыцягненне іншых арыгіналаў, змены структуры фразы (дзеля большай мілагучнасці?), спробы парафраза ці інтэрпрэтацыі, улік шырэйшага кантэксту, стылізацыя (архаізацыя ці мадэрнізацыя) і інш., часам жа матывы рашэнняў перакладчыка застаюцца проста няяснымі. Падобная варыятыўнасць трапляецца ў многіх «руськіх» перакладах, але можа ў іх і адсутнічаць ці быць прадстаўленай там мінімальна. У некаторых перакладных творах могуць не праводзіцца нават сістэмныя змены – перакладчык проста пакідае ў такім «перакладзе» граматычныя, сінтаксічныя і марфалагічныя структуры свайго іншаславянскага арыгінала. Такія помнікі, дзе сапраўдны пераклад перамяжаецца з не- ці недаперакладзенымі фрагментамі, некаторыя айчынныя даследчыкі называюць «мяшаны тэкст» (Будзько 2008, 39).

Разам з падобнай варыятыўнасцю ў «руськім» перакладзе, выкананым з максімальнай літаральнасцю, трапляюцца намнога больш рэгулярныя і частотныя аперацыі (этапы), якія выкарыстоўваюцца перакладчыкам незалежна ад таго падыходу (трансляцыя ці інфільтрацыя), які ён практыкуе. Гэтыя некалькі аперацый (ці этапаў), відаць, адбываюцца адначасова і тычацца розных узроўняў мовы (у тым ліку марфемнага і граматычнага), далей яны ілюструюцца пераважна на прыкладзе лексікі:

а) агульнаславянскія (фактычна максімальна зразумелыя) элементы арыгінала захоўваюцца (гэта звычайна і найбольш частотная лексіка): *мне*, *ты*, *сынъ*, *родъ*, *пророкъ*, *нога*, *домъ*, *даръ*, *вино*, *хлебъ*,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

*мечъ*, *часъ*, *гора*, *добрый*, *чистый*, *много*, *безъ*, *за*, *на* (у тым ліку некаторыя даўнія агульнаславянскія запазычанні: *апостолъ*, *су(б)бота*); гэта ж тычыцца і граматычных формаў і катэгорый, агульных ці аднолькавых паміж дзвюма мовамі (напрыклад, цяперашні час перакладаецца цяперашнім, адз. л. – праз адз. л. і г. д.), некаторых сінтаксічных структур;

б) больш адрозныя (фанетычна і марфалагічна) элементы арыгінала так або інакш адаптуюцца ці замяняюцца блізкімі (у структурных і/ці генетычных адносінах) элементамі (лексічнымі, марфемнымі) і затым уключаюцца ў пераклад:

● пры дапамозе (этымалагічна) адпаведных усходнеславянскіх элементаў, якія ўжо існавалі ў «руськай» мове: царк.-слав. *братръ* – *братъ*, царк.-слав. *гласъ*/пол. *głos* – *голосъ*, царк.-слав. *единъ*/пол. *jeden* – *одинъ*, царк.-слав. *нощь*/пол. *noc* – *ночъ*, царк.-слав. *вождь*/пол. *wodz* – *вожъ*, царк.-слав. *зЖбъ*/пол. *ząb* – *зубъ*, царк.-слав. *огнь*/пол. *ogień* – *огонь*, царк.-слав. *вѣра*/пол. *wiara* (*wiera*) – *вера*, пол. *miłość*/чэш. *milost* – *милость*, чэш. *výnial*/пол. *wyjął* – *вынялъ*, царк.-слав. *седе*/пол. *siedział* – *седелъ*, пол. *chciał* – *хотелъ*, пол. *zasnął* – *заснулъ*, чэш. *jsem*, *jsu*/пол. *jestem*, *są* – *есмь*, *суть*; гэта ж тычыцца і асобных граматычных формаў і катэгорый, напр.: царк.-слав. *возва* – *возвалъ* (< пол. *wezwał*), *видеша* – *видели*, *писахъ* – *писалъ*; чэш. *byl vzal* – *былъ узялъ*; пол. *giniemy* – *гинемъ*, чэш. *mluvili*/пол. *mowiliście* – *мовили*;

● пры дапамозе розных адаптацый і памарфемнага перакладу, якія папаўнялі «рускую» мову новымі лексемамі і формамі: *погорженье* (< пол. *pogarda*, *wzarda*, *wzgardzenie*), *продекъ* (< пол. *przodek*), *перестрога* 'заўвага, засцярога' (пол. < *przestroga*); сюды ж адносяцца і гібрыдныя ўтварэнні (частыя ў Скарыны) кшталту *зродихомъ се* (< царк.-слав. *родихомъ ся*, чэш. *zrodil se*), *казахъ* (< чэш. *kazal*, царк.-слав. *рекохъ*), *чиняше* (< чэш. *činila*, царк.-слав. *бяше утвердилася*), а таксама розныя спецыфічныя формы (напрыклад, прошлага часу (так званы новы, ці сінтэтычны перфект): пол. *przyszliśmy* – *пришлисмо*/*пришлихмо*);

в) архаічныя і малазразумелыя элементы арыгінала элімінуюцца і замяняюцца структурна інакшымі элементамі (у тым ліку і запазычанымі):

● царкоўнаславянскія – усходнеславянскімі і польскімі (тымі, што ўжо ўвайшлі ў склад «руськай» моўнай сістэмы): царк.-слав. *тать* – *злодей*, *глаголати* – *мовити*; аорыст і імперфект – прошлым часам (формамі на *-лъ*) і г. д.;

● польскія (чэшскія) – усходнеславянскімі і іншымі польскімі або нават царкоўнаславянскімі (не абавязкова замацаванымі ў «руськай» сістэме, часам узятымі з іншых крыніц і/ці прымальнымі (для перакладчыка) на тых або гэтых падставах), напр.: пол. *król* – *царь* (іншыя крыніцы: *король*, *круль*, пол. *pan*, царк.-слав. *царь*, *господь*); пол. *adwersarz* – *противникъ* (іншыя крыніцы: пол. *sprzeciwnik*, *sprzecznik*, царк.-слав. *соперникъ*); пол. *strawa*, *potrawa* – *покармъ*, *кормъ* (іншыя крыніцы: пол. *pokarm*, *żywność*, *jedzenie*, *jedło*, царк.-слав. *брашно*, *снедь*); пол. *wołał* – *кликалъ* (іншыя крыніцы: *волалъ*, *звалъ*, *всккликивалъ*, пол. *wołał*, царк.-слав. *возва*).

Як бачна, аснову «руськага» перакладу складаў шэраг тыповых працэдур: (а) п е р а н о с (ці захаванне – з іншага пункту гледжання) з блізкароднасных (і блізкаструктурных) моў блізкіх ці агульных элементаў пры пэўнай (б) м а д ы ф і к а ц ы і больш адрозных і (в) з а м е н е іншымі адпаведнікамі элементаў зусім чужынных або спецыфічных (гэтая апошняя працэдура, відаць, і з'яўляецца ўласна перакладам у сучасным разуменні)[5]. Такім чынам «рускаму» перакладчыку заставалася перакладаць (у сучасным разуменні) фактычна толькі невялікую частку тэксту на блізкароднаснай і блізкаструктурнай мове, тады як астатняя частка магла быць уключана ў яго пераклад (ці ў такім выпадку ўжо «пераклад»?) без змен або з нязначнымі зменамі.

Пры выкананні гэтых трох працэдур (а–в) «руськія» перакладчыкі, незалежна ад той практыкі, якой яны прытрымліваліся, карысталіся некаторымі лінгвістычнымі прыёмамі.

Адным з іх было з а п а з ы ч а н н е – перанос з арыгінала чужамоўных элементаў без перакладу (гл. Ефремов 1974, 36–37). І тут неабходна адрозніваць два тыпы запазычанняў, магчымыя ў «руськім» перакладзе: з блізкіх моў і з далёкіх. Блізкая роднаснасць моў асабліва спрыяе лексічнаму запазычанню (Там жа, 160). Матываваныя словы ў такім выпадку не падпадаюць пад дэматывацыю, а аднакарэнныя не страчваюць роднасную сувязь паміж сабой (Там жа, 161). У выніку запазычанне з блізкароднасных і блізкаструктурных моў нагадвае словаўтваральны акт у роднай мове ці нават супадае з ім (Там жа). У такіх умовах матываваныя і аднакарэнныя словы іншай мовы ўспрымаюцца як частка ці працяг сваёй,

[5] Гэты апошні працэс (в) некаторыя даследчыкі называюць «інавацыямі» (гл. Будзько 2008, 34, 37; Будзько 2013, 10, 12, 15, 20) ці «навацыямі» (гл. Будзько 2012) толькі таму, што перакладныя эквіваленты не знаходзяць сабе аднаструктурных адпаведнікаў у арыгінале (прыцягнутым для даследавання). Аднак такая тэрміналогія здаецца не зусім удалай і нават метадалагічна хібнай. Яна стварае ўражанне, быццам такія эквіваленты раней у мове не існавалі і з'явіліся толькі ў дадзеным перакладзе. Часцей за ўсё гэта не так – дастаткова толькі прыцягнуць да разгляду большае кола пісьмовых крыніц (той эпохі). На жаль, пры даследаванні «руськіх» перакладаў некаторыя сучасныя даследчыкі задавальняюцца ўлікам усяго толькі аднаго арыгінала (ці нават не яго, а толькі блізкай яму ў часе версіі), тады як старажытныя перакладчыкі (асабліва ў эпоху Рэнесансу і Рэфармацыі) часта працавалі з некалькімі, а то і многімі арыгіналамі (гл. Клімаў 2012, 185, 187). Нават праваслаўныя кніжнікі, якія перакладалі на царкоўнаславянскую мову, нярэдка карысталіся некалькімі грэчаскімі крыніцамі (гл. Лихачев 1983, 426–430). Здаецца, што пры перакладзе з блізкароднасных (і блізкаструктурных) моў выкарыстанне некалькіх, а то і многіх крыніц было тыповым для «руськіх» перакладчыкаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

тады як уласна запазычаннем становяцца, відаць, толькі неславянскія элементы (культурна адрозныя?), а таксама незразумелыя, архаічныя іншаславянскія. Прыкладам можа служыць перакладчыцкая дзейнасць Цяпінскага, які пазбягаў некаторых спецыфічна евангельскіх семітызмаў і лацінізмаў, але актыўна ўводзіў у свой пераклад лацінізмы, германізмы і багемізмы ў рэчышчы польскамоўнага ўплыву (гл. Клімаў 2012 [а], 30–31). Апрача таго, некаторыя даследчыкі прапануюць аддзяляць запазычанні «сапраўдныя» (якія ўвайшлі ў сістэму «руськай» мовы) ад эфемерных запазычанняў (інакш – аказіянальных, гл. Ефремов 1974, 38), уласцівых толькі пэўнаму перакладу або перакладчыку. Прыкладам запазычанняў апошняга кшталту могуць служыць многія багемізмы ў пражскіх выданнях Скарыны – яны адсутнічаюць у іншых «руськіх» помніках, як арыгінальных, так і перакладных, нават выкананых з чэшскіх арыгіналаў (гл. Булыка 1980, 205, 208).

Другім прыёмам, што выкарыстоўвалі «руськія» перакладчыкі ў сваёй працы, быў памарфемны пераклад, які служыў галоўным сродкам мадыфікацыі адрознай іншаславянскай лексікі. Такі пераклад, на думку некаторых вучоных, не тоесны калькаванню (гл. Ефремов 1974, 86, 92, 95, 98–99). Памарфемны пераклад часта не зусім правільна называюць адаптацыяй (усходнеславізацыяй, ці рутэнізацыяй)[6], разумеючы пад ёй прыстасаванне іншаславянскіх лексем і формаў да ўсходнеславянскага выгляду шляхам замены фанем і/ці марфем адной мовы фанемамі і/ці марфемамі іншай мовы (гл. Успенский 1983, 34, 37)[7]. Аднак здаецца, што адаптацыя сама па сабе з'яўлялася асобным прыёмам «руськіх» перакладчыкаў і павінна адрозніваецца ад памарфемнага перакладу (высвятленне гэтага пытання патрабуе асобнага разгляду).

Усе гэтыя працэдуры і прыёмы вельмі важныя для разумення прыроды «руськага» перакладу і перакладной мовы. Адны з іх пашыралі межы «руськай» мовы вельмі далёка на «захад» (у кірунку да польскай мовы, радзей – чэшскай) і на «ўсход» і «поўдзень» (у кірунку да царкоўнаславянскай мовы), робячы яе сістэму надзвычай шырокай і гнуткай. Гэта здаецца некаторым сучасным даследчыкам, выхаваным на пурызме і/ці строгім структуралісцкім функцыяналізме, яўнай заганай «руськай» мовы. Аднак разам з такімі працэдурамі і прыёмамі існавалі і іншыя, якія ўтрымлівалі «рускую» мову ў яе натуральных межах і не давалі ёй ператварыцца ў польскую або царкоўнаславянскую.

З дапамогай вызначаных працэдур і прыёмаў і на падставе максімальнага літаралізму ў «руськім» перакладзе (з блізкароднасных моў) у найбольшай ступені захоўваліся лексіка, словаўтваральная марфеміка, фразеалогія і сінтаксіс (а часам нават і флексія) арыгінала. Пры гэтым слаба было прадстаўлена калькаванне, калі разумець яго як словаўтварэнне роднай мовы паводле іншамоўнага ўзору (гл. Ефремов 1974, 86), напэўна, таму, што практычна адсутнічала несупадзенне культур, якое патрабуе калькі (гл. Верещагин 1971, 46–47, 125), – калька неўласціва кантактам паміж блізкароднаснымі мовамі (гл. Ефремов 1974, 20, 31). Затое шырока траплялiся ў такім перакладзе семантычныя запазычанні, у асноўным з польскай мовы (гл. Клімаў 2012, 167–168). У выніку «руськія» пераклады ў лексіцы, граматыцы і сінтаксісе атрымліваліся вельмі блізкімі да сваіх іншаславянскіх арыгіналаў. Здаецца, што на падставе падобных перакладаў і былі дадзены негатыўныя ацэнкі ўсёй мове. Аднак іх негатыў крыху перабольшаны.

Самі пераклады яшчэ нятоесныя ўсёй мове, а ў старажытнасці і пагатоў: іх тэкст – гэта спецыфічнае моўнае ўтварэнне, якое ўзнікала ў выніку прыстасавання адной мовы (арыгінала) да другой мовы (перакладу) (гл. Клімаў 2012, 172). Ва ўсялякім выпадку асаблівасці такіх перакладаў не павінны механічна пераносіцца на арыгінальныя помнікі (ужо хаця б таму, што рукапісныя пераклады (якія да XVII ст. дамінавалі ва ўсходнеславянскіх літаратурах) мелі вузкае пашырэнне і, адпаведна, слабы ўплыў). Некаторыя даследчыкі падкрэсліваюць перыферыйнае значэнне «руськага» перакладу, што запаўняў пераважна тэматычна-зместавыя лакуны ў літаратуры Беларусі і Украіны (гл. Семенец, Панасюк 1991, 323, 330).

Аднак відавочна, што шырокая дасяжнасць і, адпаведна, распаўсюджанасць максімальна літаральнага перакладу ў «руськай» мове зрабілі значны ўплыў на яе развіццё і функцыянаванне. Вынікам гэтага стала з'яўленне мяшанай (перакладной) мовы (фактычна варыянта, ці тыпу), якая існавала ў сферы перакладу і, відаць, крыху за яго межамі (пакуль няясна, наколькі шырока). Сапраўды, пераклад, выкананы паводле апісаных прынцыпаў, мог даваць толькі мяшаныя моўныя ўтварэнні, хаця і з усходнеславянскай асновай, аднак пры значным дамешку іншаславянскіх элементаў (усіх узроўняў, апрача, напэўна, фаналагічнага). Нарэшце варта ўлічваць і наяўнасць пэўнай міжмоўнай агульнасці многіх адзінак, катэгорый, значэнняў і класаў (гл. Верещагин 1971, 155–160) як у маўленні асобнага білінгва (якім з'яўляецца любы перакладчык), так і наогул паміж такімі структурна блізкімі і роднаснымі мовамі, як славянскія.

У навуцы пакуль нявысветлены характар такой мяшанай мовы. Адны даследчыкі параўноўваюць яе з сучаснымі трасянкай або суржыкам (гл. Свяжынскі 1990). Другія прапануюць разглядаць яе як не-

---

[6] Здаецца, што ўпершыню тэрмін «рутэнізацыя» ў дадзеным значэнні ўжыў Х. Станг (гл. Stang 1939, 135).

[7] Адпаведна вылучаюць адаптацыю на некалькіх узроўнях: фанетычным, арфаграфічным, граматычным і лексічным (гл. Успенский 1983, 37–39); вядомы і іншыя падзелы (гл. Kelly 1979, 133). Аднак у дадзенай працы лексічныя адаптацыі фактычна апісаны інакш, у рамках іншых працэдур – як замена ці мадыфікацыя блізкаструктурнай лексікі. Астатнія патрабуюць больш карэктнага размежавання з памарфемным перакладам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

дасканалую, кепска вывучаную польскую мову (гл. Verkholantsev 2008, 137–142) кшталту polszczyzny kresowej. Трэція бачаць тут (асабліва ў выданнях Скарыны) гібрыдную мову, заснаваную на граматычным мадэляванні заходне- і царкоўнаславянскіх крыніц (гл. Толстой 1988, 54; Запольская 1999, 110–117; Запольская 2003, 78–86). Чацвёртыя гавораць і пра мяшаную мову, і пра гібрыдную разам (нават у адным тэксце) у залежнасці ад адносін перакладу да арыгінала (гл. Будзько 2008, 39; Будзько 2011, 43–44).

Відаць, у гэтым пытанні трэба строга адрозніваць і размяжоўваць маўленчыя і моўныя з'явы. Вышэйакрэсленую мяшаную мову (варыянт, ці тып) сучасныя даследчыкі зараз могуць назіраць толькі ў пісьмовых тэкстах, перш за ўсё перакладных. Таму яе цяжка параўноўваць з сучаснымі вуснымі мяшанымі ўтварэннямі кшталту трасянкі ці суржыка (ва ўсялякім выпадку для гэтага патрэбна карэктная тэрміналогія і адэкватная тэорыя, чаго пакуль бракуе). Вуснае мяшанае ўтварэнне ў даўнюю эпоху магло ўзнікнуць толькі пры кантакце жывых моў – усходнеславянскай гутарковай стыхіі і польскай мовы. Але ці адлюстроўвалася такая вусная мяшанка на пісьме (напрыклад, у моцна паланізаваных тэкстах і/ці перакладах) – пакуль няясна. Таксама няясна, ці суадносілася неяк гэтая мяшаная мова з polszczyzną kresowej: ці супадала з ёю, ці была асобнай ад яе (або паралельнай?) з'явай, прадстаўленай выключна ў перакладах. Іншы кшталт мяшанкі можна назіраць ужо ў адносінах да царкоўнаславянскай мовы, якая часта захоўвалася недыферэнцавана, у сукупнасці паўднёва- і ўсходнеславянскіх рыс (так выкарыстоўвалася і нават часткова кадыфікавалася ў граматыках). Пісаць інакш на царкоўнаславянскай мове «руськія» кніжнікі ў сваёй масе, відаць, не маглі (ці маглі толькі адзінкі), таму ў іх амаль заўжды атрымлівалася мяшанка – «славянаруськая» мова. Але гэта ўжо, відавочна, інакшая мяшанка: яна ўзнікала пры сутыкненні жывога маўлення з выключна кніжнай мовай. У цэлым варта ўлічваць, што ўздзеянне польскай мовы на «руськую» мела і вусны, і кніжны характар, а царкоўнаславянскай – толькі кніжны.

Як вынік, тэарэтычна трэба дапускаць – і практыка гэта, здаецца, пацвярджае – існаванне ў складзе «рускай» мовы двух варыянтаў, ці тыпаў (у залежнасці ад зыходнай мовы арыгінала ці арыентацыі на зыходную мову) (гл. Клімаў 2013, 65):

1) моцна паланізаваны варыянт/тып які, відаць, таксама прадстаўлены і ў арыгінальных «руськіх» тэкстах, напісаных паланізаванымі русінамі ці «руська»-польскімі білінгвамі (хаця генезіс мовы арыгінальных тэкстаў у гэтым выпадку ўсё ж інакшы, чым мовы перакладных; супадзенне, напэўна, толькі паводле выніку);

2) «руська»-царкоўнаславянскі варыянт/тып, вядомы ў навуцы пад асобнай назвай – «с л а в я н а р у с ь к а я» мова (гл. Успенский 2002, 401–402). Апошняя «мова» (фактычна варыянт, ці тып) была ўласціва і арыгінальным тэкстам, але нават у гэтым выпадку яе генезіс здаецца аналагічны перакладу (паколькі ў царкоўнаславянскай мове адсутнічала жывая, гутарковая форма). Прыкладам «славянарускай» мовы могуць служыць выданні Скарыны, некаторыя творы другой паловы XVII і асабліва XVIII ст.; аднак да яе належаць, відаць, і паліятыўныя «руська»-царкоўнаславянскія тэксты XV–XVI стст., прадстаўленыя ў розных рукапісах.

Гэтыя два варыянты, ці тыпы, «рускай» мовы (свайго роду яе падмовы (субмовы) (гл. Марчук 1985, 79–81)) узніклі пад іншаславянскім уплывам і функцыянавалі пераважна ў сферы перакладу (гл. Клімаў 2013, 61–62, 65–66). Пакуль няясна, ці мелі яны нейкія вусныя адпаведнікі (што вельмі сумнiўна) і ў якім менавіта выглядзе. Кожны тып (варыянт) адрозніваўся пераважнай доляй тых або іншых (у асноўным іншаславянскіх) запазычанняў. Разам з тым кожны іншаславянскі ўплыў мог прыносіць у сваім складзе і пераважную долю тых або іншых неславянскіх запазычанняў. Так, польскі ўплыў амаль заўжды спалучаўся са значным дамешкам лацінізмаў, а царкоўнаславянскі – грэцызмаў.

Цяпер жа неабходна вярнуцца да пачатку дадзенай працы і разгледзець прычыны і акалічнасці, што прывялі да панавання ў русінаў – даўніх беларусаў і ўкраінцаў – такіх падыходаў да перакладу (трансляцыі і інфільтрацыі), якія спрыялі шырокаму залучэнню элементаў і структур арыгінала(ў) у пераклад (шляхам пераносу/захавання, з дапамогай памарфемнага перакладу і адаптацый). Гэта звязана з уяўленнямі (language attitudes) усіх адукаваных і нават проста пісьменных русінаў наконт уласнай кніжна-пісьмовай мовы. Паводле тагачасных уяўленняў такая мова ўспрымалася імі як адкрытая сістэма, у склад якой мог уваходзіць дастаткова шырокі набор моўных элементаў з іншых ці суседніх моў, калі такія элементы здаваліся больш-менш зразумелымі ці дарэчнымі, дастаткова ўжывальнымі (гл. Клімаў 2013 [а]). Ва ўмовах адсутнасці ў даўнія часы кадыфікаванай мовы[8] любая больш-менш унармаваная мова (для данарматыўнай эпохі – гэта фактычна наогул любая пісьмовая мова, але абавязкова не дыялект (вусны ідыём), а больш-менш апрацаваная, з нейкай кніжна-пісьмовай традыцыяй) магла лічыцца «сваёй» мовай (пры ўмове яе зразумеласці, уцямнасці карыстальнікам), а яе элементы – уваходзіць у склад

[8] Варта адзначыць, што кадыфікаванай мовай у XVI ст. (і нават пазней) не з'яўляліся фактычна ні польская, ні царкоўнаславянская, насуперак таму, што лічыцца на гэты конт (гл. Толстой 1988, 53, 59, 61–62, 71, 72–74; Verkholantsev 2008, 128, 130). З'яўленне граматык і слоўнікаў на гэтых мовах (з сярэдзіны ці канца XVI ст. адпаведна) яшчэ не азначае стварэння ў такіх мовах нейкіх механізмаў і інстытуцый, якія б забяспечвалі вытрымліванне і захаванне стабільных нормаў – нават у вузкім коле адукаваных асоб і пісьменнікаў. Аднак пэўную падтрымку ўжыванню (пазбяганню) тых або іншых напісанняў ці формаў падобныя граматыкі, натуральна, маглі рабіць.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

уласнай кніжна-пісьмовай мовы. Натуральна, гэта адбывалася не цалкам для ўсіх элементаў, а толькі для зразумелых (ці знаёмых перакладчыку) – лексічных, сінтаксічных, граматычных, марфемных (таму ў гэтым працэсе не ўдзельнічалі фанемныя адзінкі, паколькі яны пазбаўлены семантыкі). На такую ролю маглі прэтэндаваць роднасныя і блізкаструктурныя мовы – заходне- (польская, чэшская) і паўднёваславянскія (царкоўнаславянская, часам харвацкая/сербская). Іншыя мовы, што ўжываліся ў рэгіёне (лацінская, грэчаская, старажытнаяўрэйская і інш.), пры ўсёй іх камунікацыйнай і сацыяльнай значнасці прэтэндаваць на такі статус не маглі – яны былі незразумелыя шырокім колам беларусаў і ўкраінцаў, іх мала хто ведаў у гэтым асяроддзі.

У дадзеным працэсе тварэння кніжна-пісьмовай мовы дыялектычна ўзаемадзейнічалі дзве акрэсленыя перакладныя тэхнікі: запазычанне распаўсюджвала межы «руськай» мовы як мага шырэй, але памарфемны пераклад і адаптацыя ўтрымлівалі такую мову ва ўсходнеславянскіх (структурных) рамках, не дазваляючы ёй зліцца з іншай мовай. Аднак гэта не быў асэнсаваны, мэтанакіраваны працэс, ён ішоў стыхійна і адбываўся амаль нанава ў кожным новым перакладзе. Тым не менш нейкая эвалюцыя пры гэтым, напэўна, адбывалася (як і пэўны ўлік вопыту папярэднікаў, яго акумуляцыя), што могуць паказаць далейшыя, больш прыкладныя даследаванні.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


Будзько І. У. Старабеларускія пераклады Бібліі: Тыпалогія лінгвістычнага мадэлявання на фоне літаратурна-пісьмовых традыцый Slavia Orthodoxa і Slavia Latina // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XIV Міжнар. кангр. славістаў (Охрыд, 2008) : дакл. беларускай дэлегацыі. Мінск, 2008. С. 25–44.

Будзько І. У. Да паняццяў мяшаная і гібрыдная мовы ў кантынууме біблійных перакладаў на старабеларускую мову // Тыпалогія ўзаемасувязей беларускай і рускай моў і праблемы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 19–20 крас. 2011 г.). Мінск, 2011. С. 38–44.

Будзько І. Лексіка-семантычныя навацыі ў старабеларускіх перакладных тэкстах: На скрыжаванні культурных традыцый // Новае слова ў беларусістыцы. Літаратуразнаўства і фалькларыстыка : матэрыялы V Міжнар. кангр. беларусістаў (Мінск, 20–21 мая 2010 г.). Мінск, 2012. С. 58–71 (Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 31).

Будзько І. У. Кантамінацыя як інавацыя: Да праблемы вызначэння прынцыпу перакладу Бібліі Францыска Скарыны // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XV Міжнар. з'езд славістаў (Мінск, 20–27 жн. 2013 г.) : дакл. беларускай дэлегацыі. Мінск, 2013. С. 5–26.

Булыка А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст. Мінск, 1980.

Верещагин Е. М. Из истории возникновения первого литературного языка славян: Переводческая техника Кирилла и Мефодия. М., 1971.

Верещагин Е. М. Из истории возникновения первого литературного языка славян: Варьирование средств выражения в переводческой технике Кирилла и Мефодия. М., 1972.

[Ефремов Л. П.] Основы теории лексического калькирования : учеб. пособие. Алма-Ата, 1974.

Запольская Н. Н. «Простой» язык Библии Ф. Скорины и Псалтыри А. Фирсова: реконструкция механизма грамматического подобия // Эволюция грамматической мысли славян XIV–XVIII вв. М., 1999. С. 109–128.

Запольская Н. Н. «Общий» славянский литературный язык: Типология лингвистической рефлексии. М., 2003.

Клімаў І. П. Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага. Мінск, 2012.

Клімаў І. П. Семітызмы, грэцызмы і лацінізмы ў «Евангеллі» Васіля Цяпінскага, запазычаныя праз царкоўнаславянскую мову // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2012 [а]. № 1. С. 28–32.

Клімаў І. П. Функцыянаванне і ўзамадзеянне розных славянскіх моў і літаратур у Вялікім Княстве Літоўскім // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка : XV Міжнар. з'езд славістаў (Мінск, 20–27 жн. 2013 г.) : дакл. беларускай дэлегацыі. Мінск, 2013. С. 53–72.

Клімаў І. П. Старажытныя ўяўленні пра склад і межы кніжна-пісьмовай мовы // Весн. БДУ. Сер. 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. 2013 [а]. № 3. С. 19–25.

Лихачев Д. С. Текстология: на материале русской литературы X–XVII вв. 2-е изд. Л., 1983.

Марчук Ю. Н. Методы моделирования перевода. М., 1985.

Свяжынскі У. З гісторыі беларускай «трасянкі» // Наша слова. 1990. № 2.

Семенец О. Е., Панасюк А. Н. История перевода: (Средневековая Азия. Восточная Европа XV–XVIII вв.). Киев, 1991.

Толстой Н. И. История и структура славянских литературных языков. М., 1988.

Успенский Б. А. Языковая ситуация Киевской Руси и ее значение для истории русского литературного языка : докл. на IX Междунар. съезде славистов. М., 1983.

Успенский Б. А. История русского литературного языка: (XI–XVII вв.). 3-е изд. М., 2002.

Besters-Dilger J. Andrej M. Kurbskij als Übersetzer: Zur kirchenslavischen Übersetzungstechnik im 16. Jahrhundert. Freiburg in Breisgau, 1992 (Monumenta linguae Slavicae dialecti veteris: Fontes et dissertationes, 31).

Frick D. A. «Foolish Rus'»: On Polish civilization, Ruthenian self-hatred, and Kasijan Sakovyc // Harvard Ukrainian Studies. 1994. Vol. 18, № 3/4. P. 210–248.

Gardiner S. C. Translation technique in 17th century Russia // Slavonic and East European Review. 1963. Vol. 42, № 98. P. 110–135.

Kelly L. G. The true interpreter: A history of translating theory and practice in the West. Oxford, 1979.

Nida E. A. Towards a science of translation: With special reference to principles and procedures involved in Bible translating. Leiden, 1964.

Stang Chr. Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk. Oslo, 1939.

Struminskyj B. The language question in the Ukrainian lands before the nineteenth century // Aspects of the Slavic language question / ed. H. Goldblatt, R. Picchio. New Haven, 1984. Vol. 2 : East Slavic. P. 8–47.

Verkholantsev J. Ruthenica Bohemica: Ruthenian translations from Czech in the Grand Duchy of Lithuania and Poland. Wien ; Berlin, 2008 (Slavische Sprachgeschichte. Bd. 3).


Паступіў у рэдакцыю 30.03.2014.

*Ігар Паўлавіч Клімаў* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры БДУ культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ